Я. ГРУБНІК
метадыст 2 катэгорыі
аддзела бібліятэчнага
маркетынгу ДУК
"Мазырская раённая
цэнтральная бібліятэка
імя А.С. Пушкіна"

# "Рыфмуецца з Радзімай"

**21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы. Традыцыйна ў бібліятэках Мазырскага раёна пачынаецца Дэкада беларускай і краязнаўчай кнігі "Мову родную, край свой любіце!".**




*Паэтычны квілт "Рыфмуецца з Радзімай" прадугледжваў не толькі стварэнне "палатна" з партрэтаў і вершаў беларускіх паэтаў на роднай мове, але і даў магчымасць чытачам праверыць свае веды ў галіне айчыннай літаратуры.*

Супрацоўнікі загадзя запланавалі мерапрыемствы, якія будуць праводзіцца ў бібліятэках. Разнастайнасць формаў гэтых мерапрыемстваў не перастае здзіўляць: калейдаскоп рэкамендацый, турнір знаўцаў роднай мовы, гадзіна беларускай казкі, літаратурны экспромт, паэтычная хвілінка, вершаваны круіз, IQ-Тэст-гульня і шмат іншых. Вядома, кожная бібліятэка выбрала тыя формы, якія бліжэй да іх чытачоў. Але дэкада агульнасістэмная, таму ў гэтым годзе мы вырашылі ў Міжнародны дзень роднай мовы правесці ва ўсіх філіялах паэтычны квілт "Рыфмуецца з Радзімай". Што гэта такое? Давайце разбірацца разам.

Здаецца, тэма адна, адзін алгарытм выканання, але кожны квілт адрозніваецца сваёй арыгінальнасцю. Прапануем вам самыя крэатыўныя ідэі нашэх бібліятэкараў.

Наведвальнікі філіяла Асавецкая сельская бібліятэка мелі магчымасць прачытаць свой любімы верш услых. А палатно складалася са стыкераў, дзе пісаліся імёны аўтараў і назвы вершаў, якія былі прачытаны. Для тых, хто не пажадаў зачытваць вершы, была прадастаўлена магчымасць пазначыць "смайлікамі" тыя кнігі з вершамі, якія яны ведаюць і любяць, і таксама ўнесці свой уклад у агульнае "палатно".




Бібліятэкар філіяла Барбароўская сельская бібліятэка прапанавала чытачам напісаць на лістках па памяці радкі з любімых вершаў беларускіх паэтаў. Вельмі радуе, што многія ўдзельнікі скарысталі такую магчымасць. Але і кніжная выстава-падказка, на якой былі прадстаўлены кнігі беларускіх пісьменнікаў, прыцягвала да сябе ўвагу.

У філіяле гарадская бібліятэка № 3 вырашылі дапамагчы чытачам і зрабілі закладкі ў кнізе такім жа колерам, што і лісты з партрэтамі аўтараў, каб уважлівы наведвальнік меў магчымасць з такой дапамогай правільна прыклеіць стыкер.

Стыкеры самі па сабе невялікага памеру, таму для зручнасці наведвальнікаў супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Мазырскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна змясцілі на плакат з квілтам тыя ж вершы на лістах большага памеру.

А ў філіяле Махнавіцкая сельская бібліятэка гучала музыка. І не проста для прыемнай атмасферы, а менавіта як частка паэтычнага квілта. Бібліятэкар прапанавала чытачам пазнаць не проста вершы, а тыя, якія былі пакладзены на музыку.

У нашым квілце ўдзельнічалі людзі рознага ўзросту і рознага сацыяльнага статусу. Большасць з іх з лёгкасцю пазнавалі радкі з вершаў знакамітых беларускіх класікаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Танка, Максіма Багдановіча. А вось вершы менш вядомых аўтараў выклікалі цяжкасці. У такіх выпадках бібліятэкар раіў звярнуцца да кніжнай выставы і разам знайсці адпаведнасці.

Атрымаўшы такую вялікую колькасць цікава арганізаваных квілтаў, мы вырашылі выбраць лепшыя з іх і ўзнагародзіць супрацоўнікаў за крэатыўныя ідэі салодкімі прызамі. Чаму менавіта салодкімі? Таму што наша мова гучыць соладка для сэрца беларуса.

Своеасаблівым вынікам паэтычнага квілта сталі ўсмешкі і пазітыўны настрой нашых чытачоў. А калі карыстальнік задаволены – бібліятэкар справіўся са сваёй задачай.





Мазырская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.С. Пушкіна

# "Рыфмуецца з Радзімай"




Квілт – гэта шытае палатно, выкананае ў тэхніцы ласкутнага шыцця. Але не, нашым бібліятэкарам і іх чытачам не прыйшлося шыць, бо паэтычны квілт – гэта крыху іншае паняцце.

Сутнасць яго ў тым, каб скласці плакат з асобных лісткоў па пэўнай тэме. Аснову квілта, яго макет рыхтуе бібліятэкар, але кожны чытач можа паўдзельнічаць у яго напаўненні.

Запісваючы адказы на рознакаляровыя стыкеры і прымацоўваючы іх, чытачы разам з бібліятэкарам ствараюць узор палатна на інфармацыйным стэндзе, гэта значыць кожны ўносіць свой уклад у агульную справу.

Я. ГРУБНІК